

Полацкі ўзорны дзіцячы духавы аркестр «Арляня».

**ПОЛАЦКІ ЎЗОРНЫ ДЗІЦЯЧЫ ДУХАВЫ АРКЕСТР «АРЛЯНЯ»** Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Шкловалакно». Створаны ў 1976, з 1981 мае званне ўзорнага. Арганізатар і кіраўнік Я. Топаз.

У рэпертуары творы бел. і інш. сав. кампазітараў («Радзіма мая дарагая» У. Алоўнікава, «Юбілейны марш» Я. Глебава, «Беларуская танцавальная» Э. Багуслаўскай, «Марш беларускіх піянераў» Р. Пукста, «Беларускі вальс» А. Шыдлоўскага, «У лесе прыфрантавым» М. Блантэра, «Хай заўжды будзе сонца» А. Астроўскага, «Ленін заўжды з табой» С. Тулікава, «Героі астаюцца маладымі» А. Пахмутавай, «Радзіма мая» і «Дзень Перамогі» Д. Тухманава і інш.), рускай і замежнай класікі («Неапалітанскі танец» П. Чайкоўскага, «Контрданс» Л. Бетховена, паланез «Развітанне з Радзімаю» М. Агінскага).
*З. А. Танклеўскі.*

**ПОЛАЦКІ ЎЗОРНЫ ЮНАЦКІ ТЭАТР-СТУДЫЯ** Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Шкловалакно». Створаны ў 1975, з 1980 мае званне ўзорнага. Арганізатар і кіраўнік В. Нагорная.

У рэпертуары: «Беларуская калыханка» паводле В. Віткі, «У дзень з дажджом і градам» Г. Марчука, «Казка пра цара Салтана» паводле А. Пушкіна, «Любоў да трох апельсінаў» М. Святлова, «Дванаццаць месяцаў» С. Маршака, «Зорачка-Соня» Ф. Мільчынскага, «Выкрадальнікі цудаў» Л. Усцінава, «Беласнежка і сем гномаў» Усцінава і А. Табакова, «Адважнае сэрца» І. Эвальд, «Спытай калі-небудзь у траў» Я. Стэльмаха. Калектыў — лаўрэат рэсп. агляду-конкурсу нар. тэатраў, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (1982).
*П. Р. Масленікаў.*



Полацкі ўзорны юнацкі тэатр-студыя. Сцэна са спектакля «Казка пра цара Салтана».

**ПОЛАЦКІ ХРАМ-ПАХАВАЛЬНЯ.** Існаваў у 1-й пал. 12 — 1-й пал. 17 ст. Уваходзіў у ансамбль *Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра.* Быў пабудаваны ў традыцыях *Полацкай школы дойлідства.* Паводле археал. даследаванняў 1947, 1961—62, 1964, 1976 храм быў 3-нефавы, 4-стаўповы, крыжова-купальны (шырыня 14,85 м, даўж. без апсід 17,2 м), 3-апсідны (бакавыя апсіды размешчаны ў тоўшчы ўсх. сцяны). З Пд, З і Пн абнесены галерэяй (шырыня 4,1 м), якая пераходзіла ў невял. капліцы з самастойнымі апсідамі. Сцены складзены з плінфы ў тэхніцы муроўкі «са схаваным радам». Фасады былі аформлены лапаткамі ступеньчатага профілю. Унутры храм быў багата аздоблены. Знойдзена шмат кавалкаў тынкоўкі з фрэскавай размалёўкай, з арнаментам, выявамі святых і анёлаў. Узорыстая мазаічная падлога была выкладзена з жоўтых, чорных і зялёных керамічных паліваных плітак рознай формы; малюнкі выкладаліся з чорнай, чырвона-карычневай, жоўтай і зялёнай смальты ў форме квадратаў, трохвугольнікаў і палосак. Знойдзены рэшткі мужчынскіх пахаванняў у цагляных камерах. Відаць, храм быў пахавальняй полацкіх епіскапаў. Ад П. х.-п. асталіся падмуркі і часткова ніжнія часткі сцен.



Полацкі храм-пахавальня. План.

*Літ.:* Раппопорт П. А. Полоцкое зодчество XII века.— Советская археология, 1980, № 3; яго ж. Русская архитектура X—XIII вв.: Каталог памятников.— Л., 1982.— (Свод археологических источников; в. Е 1—47); Сяліцкі А. А. Фрэскі храма-магільні Ефрасіньеўскага манастыра.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1979, № 4.
*А. А. Трусаў.*

**ПОЛАЦКІЯ ВЕЖЫ.** 2 вежы, існавалі паміж 1563—79. Абарончыя збудаванні тыпу *данжонаў* стаялі на Верхнім Полацкім замку. Размяшчаліся асобна ад лініі замкавых умацаванняў у цэнтры дзядзінца. Пабудаваны з

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ